Упраўленне па адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна г.Мінска
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі “Маяк” г.Мінска”
Аддзел мастацкага выхавання

УЗГОДНЕНА
Начальнік упраўлення па адукацыі адміністрацыі Ленінскага раёна г.Мінска
_______________Н.Г.Кучынская
“___”_____________2022 г.

ЗАЦВЕРДЖАНА
Загад дырэктара ЦДАДзіМ “Маяк” г.Мінска
ад “___”_________ _______2022 г.
№__________
________________ А.М.Міхайлідзі

**Праграма гуртка «МЛЫНОК»**
(мастацкі профіль, базавы ўзровень вывучэння адукацыйнай галіны “Музычная творчасць”, накірунак “Фальклорны ансамбль”)

Складальнік:
Мардань Дар’я Анатольеўна,
педагог дадатковай адукацыі першай кваліфікацыйнай катэгорыі

Метадычнае суправаджэнне:
Шачанок Ірына Аляксандраўна,
метадыст першай кваліфікацыйнай катэгорыі

Узрост навучэнцаў – 9-13 гадоў
Тэрмін рэалізацыі праграмы – 2 гады

РЭКАМЕНДАВАНА
на пасяджэнні метадычнага савета
ад «_____» __________ 2022 г.
Пратакол № ______________

Мінск 2022

## Тлумачальная запіска

Кожны чалавек павінен ведаць традыцыі і мову свайго народа, таму трэба ўсвядоміць: чым больш будзе нацыянальнага ў выхаванні, тым мацнейшым стане духоўнае багацце нацыі. Далучэнне да народных традыцый, абрадаў і святаў спрыяе markdownрознабаковаму развіццю і выхаванню дзяцей розных узростаў, фармаванню свабоднай, духоўнай і творчай асобы.

Праца з музычным і вусным фальклорным матэрыялам з’яўляюцца адным з лепшых сродкаў развіцця творчых здольнасцей навучэнцаў. Пачынаць знаёміць падрастаючае пакаленне з фальклорам трэба з ранняга ўзросту. Фальклор дазваляе не толькі ажыццяўляць грамадзянскае выхаванне, але і эфектыўна фарміраваць творчыя ўменні і навыкі. Аўтэнтычныя традыцыі выканання песень атрымалі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь, таму вельмі важна працягваць традыці і перадаваць свае веды моладзі.

Навучанне народным аўтэнтычным спевам на сучасным этапе развіцця культуры набывае зусім новую і надзвычай адказную ролю. Народна-пеўчая педагогіка заклікана ўсталяваць мост паміж свядомасцю народа, народнай мудрасцю і сучасным грамадствам, спачатку ў навучэнцаў, якія навучаюцца менавіта аўтэнтычным спевам, а затым і ў больш шырокай аўдыторыі.

Навізна дадзенай праграмы ў тым, што яе засваенне адбываецца ў непасрэднай узаемасувязі з рознымі відамі народнай творчасці, этнаграфіяй і міфалогіяй. Іх комплекснае ўзаемадзеянне заклікана ажыццяўляць асноўныя палажэнні па ахове, зберажэнні і трансляцыі каштоўнасцей традыцыйнай беларускай культуры.

Актуальнасць праграмы абумоўлена тым, што, захаванне і развіццё нацыянальнай культуры, сваіх каранёў – гэта найважнейшая задача, якая патрабуе беражлівых адносін да помнікаў гісторыі і культуры, да традыцыйнай народнай мастацкай творчасці. Адраджэнне фальклору, народных звычаяў, абрадаў і святаў, традыцыйнага дэкаратыўна-прыкладнога і выяўленчага мастацтва – гэта актуальная праблема сучаснасці. Фальклор, яго жанры, сродкі, метады найбольш поўна папаўняюць усю карціну народнага жыцця, даюць яркую карціну побыту народа, яго маральнасці, духоўнасці.Таму перад сістэмай агульнай і дадатковай адукацыі стаіць задача – адрадзіць пераемнасць пакаленняў, у максімальна поўным аб’ёме перадаць падрастаючаму пакаленню традыцыйныя маральныя асновы, сфармаваць патрыятычныя перакананні. Засваенне зместу праграмы спрыяе развіццю мастацкага інтэлекту, творчай фантазіі пад час працы над вобразамі песен і персанажамі абраду, творчага мыслення і эстэтычнага стаўлення да наваколля.

Дадзеная праграма распрацавана і складзена на аснове тыпавой праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (мастацкі профіль), зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 6 верасня 2017 г. № 123.

**Мэта:** развіццё творчых здольнасцей навучэнцаў сродкамі аўтэнтычных спеваў.

**Задачы**

**навучальныя:**

- развіваць творчыя здольнасці, пашыраць эмацыянальна-вобразны свет дзяцей сродкамі каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай музыкі;
- далучаць дзяцей і падлеткаў да аўтэнтычных форм народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

**развіццёвыя:**

- садзейнічаць гарманізацыі асобы навучэнца шляхам далучэння да беларускага этнамузычнага мастацтва;
- выхоўваць на аснове фальклору пачуццё патрыятызму і любові да Бацькаўшчыны.
- развіваць мастацкі густ сродкамі беларускага фальклору;

**выхаваўчыя:**

- фарміраваць каштоўнасныя арыенціры ў напрамку ўсведамлення значнасці традыцыйнай культуры свайго народа ў сістэме культуры чалавецтва.

Праграма пабудавана на наступных педагагічных прынцыпах:

- прынцып актуальнасці (максімальнае набліжэнне зместу праграмы да рэальных умоў жыцця і дзейнасці вучняў);
- прынцып навуковасці (змест дзейнасці гуртка абапіраецца на сучасныя навуковыя дасягненні);
- прынцып мэтанакіраванасці;
- прынцып індывідуальнасці, даступнасці, паслядоўнасці (прадугледжвае пабудову зместу навучальнага працэсу ад простага да складанага);
- прынцып сістэматычнасці;
- прынцып свядомасці і актыўнасці;
- прынцып нагляднасці (шырокае выкарыстанне наглядных і дыдактычных дапаможнікаў, тэхнічных сродкаў навучання);
- прынцып сувязі тэорыі з практыкай (арганічнае спалучэнне неабходных тэарэтычных ведаў і практычных уменняў і навыкаў у працы з навучэнцамі);
- прынцып выніковасці (валоданне аўтэнтычнымі спевамі);
- прынцып выхаваўчага і развіццёвага навучання;
- прынцып міжпрадметнасці (міждысцыплінарнасць зместу педагагічнага ўзаемадзеяння, ажыццяўлення міжпрадметных сувязей);
- прынцып культуралагічнасці (адпаведнасць праграмы часу, сацыякультурнай сітуацыі, асаблівасцям краіны, рэгіёнаў, установы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі).

Дадзеная праграма прызначана для навучэнцаў ва ўзросце ад 9 да 13 гадоў.

Змест праграмы прадугледжвае 2 гады навучання. Групы фарміруюцца па ўзроставых катэгорыях.

**Першы год навучання**

Узрост навучэнцаў – 9-12 гадоў. Заняткі праводзяцца 2 разы на тыдзень па 2 вучэбныя гадзіны. Агульная колькасць вучэбных гадзін на год – 144. Напаўняльнасць групы – не менш за 12 чалавек.

## Другі год навучання

Узрост навучэнцаў – 10-13 гадоў. Заняткі праводзяцца 2 разы на тыдзень па 2 вучэбныя гадзіны. Агульная колькасць вучэбных гадзін на год – 144. Напаўняльнасць групы – не менш за 8 чалавек.

Форма правядзення заняткаў – групавая.

Заняткі праводзяцца ў кабінеце, які адпавядае санітарна-гігіенічным нормам, патрабаванням правілаў бяспечных паводзін, пажарнай бяспекі.

Матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне: відэамагнітафон; мікрафон; калонка; CD-прайгравальнік; музычны інструмент; радыёапаратура.

## 1-ы год навучання

**Задачы:**

– знаёміць з каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай музыкай;

– знаёміць з аўтэнтычнымі формамі народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

– навучаць асновам вакальна-харавога майстэрства;

– навучаць асновам аўтэнтычнай манеры спеваў;

– навучаць спевам твораў з беларускага календара.

### Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Назва раздзела (тэмы) праграмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго гадзін | Тэарэтычных | Практычных |
| | **Уводны занятак** | **2** | **2** | **-** |
| **1.** | **Вакальна-харавыя навыкі** | **30** | **10** | **20** |
| 1.1 | Пеўчае дыханне | 6 | 2 | 4 |
| 1.2 | Дыкцыя і артыкуляцыя. Спецыфіка дыялектаў | 6 | 2 | 4 |
| 1.3 | Ановы аўтэнтычных спеваў | 6 | 2 | 4 |
| 1.4 | Музычны і тэмбральны слых | 6 | 2 | 4 |
| 1.5 | Манера выканання розных этнаграфічных рэгіёнаў | 6 | 2 | 4 |
| **2.** | **Спевы беларускага календара** | **64** | **24** | **40** |
| 2.1 | Восеньскія песні. “Жніво”. “Багач” | 16 | 6 | 10 |
| 2.2 | Зімовыя песні. “Каляды” | 16 | 6 | 10 |
| 2.3 | Веснавыя песні. Масленічныя спевы. “Гуканне вясны” | 16 | 6 | 10 |
| 2.4 | Летні цыкл песень. “Купалле”: традыцыі і абрады | 16 | 6 | 10 |
| **3.** | **Народныя музычныя гульні** | **10** | **2** | **8** |
| **4.** | **Работа над творамі. Рэпетыцыйная праца** | **26** | **6** | **20** |
| 4.1 | Работа над творамі | 16 | 4 | 12 |
| 4.2 | Рэпетыцыйная праца | 10 | 2 | 8 |
| **5.** | **Канцэртная дзейнасць** | **10** | **-** | **10** |
| | **Выніковы занятак** | **2** | **-** | **2** |
| | **Усяго:** | **144** | **46** | **98** |

## Змест праграмы

**Уводны занятак**

Азнаямленне навучэнцаў з планам работы гуртка. Заняткі па мерах бяспекі.

**1. Вакальна-харавыя навыкі**

**1.1 Пеўчае дыханне**

Асновы пеўчага дыхання. Дыяфрагмальнае дыханне.

*Практычныя заняткі.* Адпрацоўка правільнай пеўчай пасадкі. Праца над пеўчым дыханнем.

**1.2 Дыкцыя і артыкуляцыя. Спецыфіка дыялектаў**

Дыялекты беларускай мовы. Гаворкі Панямоння, Падзвіння, Палесся.

*Практычныя заняткі.* Праслухоўванне песень з выразнымі дыялектнымі асаблівасцямі (жніўная "Ой дайтэ мне раду").

**1.3 Асновы аўтэнтычных спеваў**

Паняцце "аўтэнтычныя спевы". Манеры выканання ў розных абласцях Беларусі.

*Практычныя заняткі.* Практыкаванні на распрацоўку гуку груднога, сярэднеязыянага і галаўнога рэзанатараў. Адпрацоўка дыяфрагмальнага дыхання.

**1.4 Музычны і тэмбральны слых**

Тэмбральны слых як галоўны фактар выканання спеваў у розных манерах.

*Практычныя заняткі.* Практыкаванні на спевы ў манеры Брэсцкага Палесся, Панямоння і іншых этнаграфічных рэгіёнаў.

**1.5 Манера выканання розных этнаграфічных рэгіёнаў**

Асаблівасці выканання абрадавых песень у розных рэгіёнах Беларусі: Панямонні, Палессі, Паазер'і, Падзвінні. Набліжанасць манеры да аўтэнтычнага выканання.

*Практычныя заняткі.* Практыка спеваў у сярэднеязычным, грудным і галаўным рэзанатарах. Праслухоўванне і выкананне песень Брэсцкага Палесся (грудны рэзанатар), Віцебскага Паазер'я (сярэднеязычны, галаўны рэзанатары).

**2. Спевы беларускага календара**

**2.1 Восеньскія песні. "Жніво". "Багач"**

Функцыянальна-жанравыя групы жніўных песень: зажынкавыя, уласна жніўныя і дажыначныя. Этнафанічныя нормы выканання песень жніва: "галосныя" спевы ў акустыцы адкрытай прасторы прыроднага асяроддзя; тэмбрава-дынамічная напружанасць песенных выказванняў.

*Практычныя заняткі.* Выкананне жніўных песень "А на двары зміркаецца", "Спор жыта, спор", "А йшоў Раю", "А ў нашага пана дажыначкі рана".

**2.2 Зімовыя песні. "Каляды"**

Этнафанічная партытура каляднага абраду ў Беларусі. Рытмаінтанацыйныя асаблівасці калядных песень: рэчытатыўны характар, гучнае, "шумнае" выкананне. Агульныя рысы і адрозненні калядак і шчадровак.

*Практычныя заняткі.* Праца над песняй "Прыйшла Каляда". Пастаноўка каляднага абраду "Ваджэнне казы". Развучванне песні "Го-го-го каза".

**2.3 Веснавыя песні. Масленічныя спевы. “Гуканне вясны”**

Этнафанічныя асаблівасці спеваў вясновага перыяду: спевы ў акустыцы адкрытай прасторы прыроднага асяроддзя. Дынамічная напружанасць песенных тэкстаў. Рэгіянальныя асаблівасці этнафанічнай экспрэсіі. Традыцыя святкавання Масленіцы. Розніца масленічных напеваў у розных рэгіёнах Беларусі.

*Практычныя заняткі.* Развучванне масленічных песень “Масленая, вот я йду”, “На вуліцы Масленіца”.

**2.4 Летні цыкл песень. “Купалле”: традыцыі і абрады**

Прыродныя і астральныя цыклы як аснова летняй абраднасці. “Купалле”. Паходжанне назвы. Генезіс купальскіх звычаяў і абрадаў, іх агульнаеўрапейскія рысы. Сучасныя купальскія традыцыі ў Беларусі. Архаічнасць “Купалля” – асноўнага ў сістэме геліяцэнтрычных абрадаў гадавога кола. Семантыка святаў летняга перыяду – “Провады Русалкі”, “Купалле”. Песні абраду “Провады русалкі”.

*Практычныя заняткі.* Рэканструкцыя часткі абраду “Провады русалкі”. Развучванне песень “Прывяду русалку”, “На граной нядзеле”. Знаёмства з асаблівасцямі купальскага рэпертуару. Купальскія павер’і, легенды, прыкметы і паданні беларусаў. Купальская песня “Пойдзем дзеўкі кругом жыта”. Развучванне слоў, напеваў, харэаграфічных рухаў і інструментальнага суправаджэння купальскай песні.

**3. Народныя музычныя гульні**

Народныя гульні “Явар”, “Цяцерка”, “Юрачка”, “Цярэжка”, Прыпеўкі да побытавага танца “Дзева ў сенях стаяла”.

*Практычныя заняткі.* Развучванне слоў гульняў, прагляд правіл гульні ў запісах са святаў і экспедыцый. Развучванне слоў, напеваў, рухаў і інструментальнага суправаджэння гульні “Явар”. Песня-гульня “Юрачка”.

**4. Работа над творамі. Рэпетыцыйная праца**

**4.1 Работка над творамі**

Паняцці “песня”, “аўтар”, “змест”, “структура песні”. Паказ і праслухоўванне песень і іх аналіз. Развучванне рэпертуарных твораў у суправаджэнні клавішнага інструмента. Разбор сродкаў музычнай выразнасці (лад, гармонія, тэмп, метр, рытм, дынамічныя адценні), якія спрыяюць раскрыццю мастацкага вобраза песні.

*Практычныя заняткі.* Выбудоўванне ўнісону, адпрацоўка правільнага інтанавання меладычных хадоў і скокаў, кантыленных спеваў. Развучванне твораў па фразах. Прапяванне мелодый песень без суправаджэння. Выкананне песень пад мінусавую фанаграму. Праца над інтанацыйнымі складанасцямі ў творы. Праца над дыкцыйнымі складанасцямі.

**4.2 Рэпетыцыйная праца**

Фразіроўка, нюансіроўка, кульмінацыя твора.

*Практычныя заняткі.* Трэніроўка вакальна-тэхнічных навыкаў, неабходных для перадачы музычнага зместу песні. Разбор і адпрацоўка тэхнічна складаных месцаў. Праца над фразіроўкай, нюансіроўкай, кульмінацыяй твора. Адпрацоўка элементаў двухгалосся. Праца па партыях.

Злучэнне партый. Выкананне вакальна-харавых твораў. Праца над ансамблем, строем, чысцінёй і ўстойлівасцю вакальнай інтанацыі. Злучэнне харэаграфічных рухаў са спевам. Выкананне твораў на сцэне.

**5. Канцэртная дзейнасць**

Удзел у канцэртах, фестывалях і конкурсах.

**Выніковы занятак**

Канцэрт з запрашэннем бацькоў.

## Прыкладны рэпертуар

1. "Масленая, вот я йду".
2. "На вуліцы Масленіца".
3. "Пойдзем, дзеўкі, кругом жыта".
4. "Прыйшла Каляда".
5. "Го-го-го, каза".
6. "Шчодрык-ведрык".
7. "Ой, смародзіна".
8. "Яшчар".

## Чакаемыя вынікі

Пасля заканчэння першага года навучання навучэнцы павінны

**ведаць:**

– каляндарна-абрадавую і пазаабрадавую музыку;

– аўтэнтычныя формы народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

– значнасць традыцыйнай культуры свайго народа ў сістэме культуры чалавецтва;

**умець:**

– вызначаць аўтэнтычную манеру выканання ў адрозненні ад стылізаванай;

– апісваць і пазнаваць абрадавую і пазаабрадавую музыку;

– выконваць беларускія народныя песні ў аўтэнтычнай манеры;

**валодаць:**

– асновамі аўтэнтычнай манеры спеваў;

– ведамі каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай паэзіі беларусаў.

## 2-і год навучання

**Задачы:**

– працягваць знаёміць з каляндарна-абрадавай і пазаабрадавай музыкай;

– працягваць знаёміць з аўтэнтычнымі формамі народнага музычна-харэаграфічнага мастацтва;

– працягваць навучаць асновам вакальна-харавога майстэрства;

– працягваць навучаць асновам аўтэнтычнай манеры спеваў;

– навучаць спевам твораў з беларускага календара (восеньскія абрады: "Жніво", "Багач", "Іліпаўка"; зімовыя і веснавыя святы: "Каляды", "Валачобніцтва"; летні цыкл песень: "Купалле").

## Вучэбна-тэматычны план

| № п/п | Назва раздзела (тэмы) праграмы | Колькасць гадзін | | |
|---|---|---|---|---|
| | | Усяго гадзін | Тэарэтычных | Практычных |
| | **Уводны занятак** | **2** | **2** | **-** |
| **1.** | **Вакальна-харавыя навыкі** | **10** | **2** | **8** |
| **2.** | **Беларуская народная творчаць** | **16** | **6** | **10** |
| 2.1 | Элементы народнага касцюма рэгіёнаў Беларусі | 4 | 2 | 2 |
| 2.2 | Міфалогія Беларусі | 6 | 2 | 4 |
| 2.3 | Народныя музычныя гульні | 6 | 2 | 4 |
| **3.** | **Восеньскія абрады** | **36** | **12** | **24** |
| 3.1 | “Жніво” | 12 | 4 | 8 |
| 3.2 | “Багач” | 12 | 4 | 8 |
| 3.3 | “Пілiпаўка” | 12 | 4 | 8 |
| **4.** | **Зімовыя і веснавыя святы** | **36** | **12** | **24** |
| 4.1 | Калядныя песні | 12 | 4 | 8 |
| 4.2 | “Каляды” | 12 | 4 | 8 |
| 4.3 | Веснавы цыкл. Абрад “Валачобніцтва” | 12 | 4 | 8 |
| **5.** | **Летні цыкл песень. Абрады на Купалле** | **12** | **4** | **8** |
| **6.** | **Работа над творамі. Рэпетыцыйная праца** | **20** | **6** | **14** |
| 6.1 | Работа над творамі | 10 | 4 | 6 |
| 6.2 | Рэпетыцыйная праца | 10 | 2 | 8 |
| **7.** | **Канцэртная дзейнасць** | **10** | **-** | **10** |
| | **Выніковы занятак** | **2** | **-** | **2** |
| | **Усяго:** | **144** | **44** | **100** |

## Змест праграмы

### Уводны занятак

Азнаямленне навучэнцаў з планам работы гуртка. Заняткі па мерах бяспекі.

### 1. Вакальна-харавыя навыкі

Пеўчае дыханне. Дыкцыя і артыкуляцыя. Спецыфіка дыялектаў. Асновы аўтэнтычных спеваў. Музычны і тэмбральны слых. Манера выканання розных этнаграфічных рэгіёнаў.

*Практычныя заняткі.* Адпрацоўка правільнай пеўчай пасадкі. Праца над пеўчым дыханнем. Праца над песнямі з выразнымі дыялектнымі асаблівасцімі (“Ой дайтэ мне раду”, жніўная.). Практыкаванні на распрацоўку гуку груднога, сярэднеязыянага і галаўнога рэзанатараў. Адпрацоўка дыяфрагмальнага дыхання. Практыкаванні на спевы ў манеры Брэсцкага Палесся, Панямоння і іншых этнаграфічных рэгіёнаў. Практыка спеваў у сярэднеязычным, грудным і галаўным рэзанатарах. Праслухоўванне і выкананне песень Брэсцкага Палесся (грудны рэзанатар), Віцебскага Паазер’я (сярэднеязычны, галаўны рэзанатары).

### 2. Беларуская народная творчаць

**2.1 Элементы народнага касцюма рэгiёнаў Беларусi**

Беларускі народны касцюм і яго роля ў фарміраванні іміджу Беларусі. Мужчынскі касцюм. Жаночы касцюм. Тканіны і матэрыялы. Упрыгожванні. Абутак. Касцюмы рэгіёнаў Беларусі.

*Практычныя заняткі.* Азнаямленне з фотаальбомам "Беларускі народны касцюм" М. Раманюка. Складанне карты народных строяў.

**2.2 Міфалогія Беларусі**

Асноўныя асаблівасці міфалогіі Беларусі як важнейшай з'явы культуры. Міфалогія: стасункі чалавека і прыроды. Міфы – канкрэтна-вобразная форма тлумачэння з'яў жыцця.

*Практычныя заняткі.* Міфалагічныя персанажы ў абраднасці беларусаў: падрыхтоўка вобраза і яго інсцэніроўка.

**2.3 Народныя музычныя гульні**

Народныя гульні "Явар", "Цяцерка", "Юрачка", "Цярэжка", Прыпеўкі да побытавага танца "Дзева ў сенях стаяла".

*Практычныя заняткі.* Развучванне слоў гульняў, прагляд правіл гульні ў запісах са святаў і экспедыцый. Развучванне слоў, напеваў, рухаў і інструментальнага суправаджэння гульні "Явар". Песня-гульня "Юрачка".

**3. Восеньскія абрады**

**3.1 "Жніво"**

Этнафанічныя нормы выканання жніўных песень: "галосныя" спевы ў акустыцы адкрытай прасторы прыроднага асяроддзя. Тэмбрава-дынамічная напружанасць песенных выказванняў. Традыцыя жаночых гуртавых спеваў. Сутнасць абрадаў "Завіванне барады", "Зажынкі", "Дажынкі".

*Практычныя заняткі.* Вывучэнне жніўных песень "Ой наш пан", "Ой дайтэ мне раду", "Жнеечкі".

**3.2 "Багач"**

Семантыка свята "Багач" – старажытнага свята заканчэння ўборкі збожжа. Аграрная атрыбутыка абраду (калектыўны збор зернавых культур, выраб лубка з зернем і свечкай, абходы хат, калектыўная вячэра). Народныя прыкметы і павер'і, метэаралагічныя назіранні.

*Практычныя заняткі.* Развучванне песні "Кругом яра". Пастаноўка свята "Багач".

**3.3 "Піліпаўка"**

Народныя ўяўленні, звязаныя з Піліпаўкай. Пост. Асаблівасці харчавання. Апрацоўка льну (попрадкі). Вячоркі-пасядзелкі. Народныя метэаралагічныя назіранні і прыкметы. Посніцкія і піліпаўскія песні ("Піліпаўскія", "Мікольскія", "За кудзеляй", "На супрадках").

*Практычныя заняткі.* Развучванне песень "Каля майго церама", "А ў новых сенях". Інсцэніроўка "Піліпаўскіх вячорак".

**4. Зімовыя і веснавыя святы**

**4.1 Калядныя песні**

Свята зімовага сонцастаяння ў народаў Еўропы. Каляды і Раство Хрыстова – характарыстыка дзвюх рэлігійна-культурных традыцый. Асноўныя

этапы Каляд. Тры куцці, іх назвы і значэнне. Абрады ваджэння казы, каня, жорава, мядзведзя на поўдні Беларусі.

*Практычныя заняткі.* Развучванне песень “Добры вечар!”, “Святы вечар!”, “Каляда!”, “Ой, калядкі” (Палессе) і “Коліда!”, “Коліда, Коліда!”, “Коліда, молада!” (Паазер’е). Канты (Паазер’е).

**4.2 “Каляды”**

Карнавальнасць светаадчування падчас калядных гульняў (з «казой», «буслам», «мядзведзем» і інш.).

*Практычныя заняткі.* Абрадавыя гульні “Жаніцьба Цярэшкі”, “Мацей”, “Цары”, “Яшчур” і інш.

**4.3 Веснавы цыкл. Абрад “Валачобніцтва”**

Масленіца. Абрад “Валачобніцтва”. Прыродныя і астральныя цыклы як аснова веснавой абраднасці. Веснавыя традыцыі і абрады ўсходніх славян. Гуканне вясны. Масленіца. Генезіс, структура, функцыянальныя напрамкі і адметныя асаблівасці беларускіх свят сустрэчы вясны. Абрадавая ежа. Веснавыя гульні, карагоды.

*Практычныя заняткі.* Развучванне масленічных песень “Гу-та-та, гу-ля-лё!”, “Гу-ля-лё, рана маё!”, “Масленіца, Масленіца!”. Праца з безрэфрэннымі масленічнымі напевамі (паўднёва-цэнтральная частка Беларускага Паазер’я), валачобнымі песнямі “Ішла тучка”, “А ў нядзельку да параненька”.

**5. Летні цыкл песень. Абрады на Купалле**

Гульні моладзі каля вогнішча (перакідванне вянкоў, паасобныя і парныя скокі праз касцёр, карагоды-ігрышчы). Гульнявыя элементы ў карнавальным абходзе вёскі. Спецыфічныя гульнявыя дзеянні купальскіх кірмашоў (спаборніцтвы на вадзе, конныя гульні).

*Практычныя заняткі.* Развучванне песень “Купала на Йвана!”, “Ноч малая ды купальная!”, “Іграй, сонца, ды з зарою!”, “То-то!”, “Купалля!”, “Сонейка!”, “Ой, рана на Йвана!” і інш. Аналіз асаблівасцей структурна-рытмічнай формы беларускіх напеваў Купалля. Інсцэніроўка абрада “Бараны”.

**6. Работа над творамі. Рэпетыцыйная праца**

**6.1 Работа над творамі**

Паняцці “песня”, “аўтар”, “змест”, “структура песні”. Паказ і праслухоўванне песень і іх аналіз. Развучванне рэпертуарных твораў у суправаджэнні клавішнага інструмента. Разбор сродкаў музычнай выразнасці (лад, гармонія, тэмп, метр, рытм, дынамічныя адценні), якія спрыяюць раскрыццю мастацкага вобраза песні.

*Практычныя заняткі.* Выбудоўванне ўнісону, адпрацоўка правільнага інтанавання меладычных хадоў і скокаў, кантыленных спеваў. Развучванне твораў па фразах. Прапяванне мелодый песень без суправаджэння. Выкананне песень пад мінусавую фанаграму. Праца над інтанацыйнымі складанасцямі ў творы. Праца над дыкцыйнымі складанасцямі.

**6.2 Рэпетыцыйная праца**

Фразіроўка, нюансіроўка, кульмінацыя твора.

*Практычныя заняткі.* Трэніроўка вакальна-тэхнічных навыкаў, неабходных для перадачы музычнага зместу песні. Разбор і адпрацоўка

тэхнічна складаных месцаў. Праца над фразіроўкай, нюансіроўкай, кульмінацыяй твора. Адпрацоўка элементаў двухгалосся. Праца па партыях. Злучэнне партый. Выкананне вакальна-харавых твораў. Праца над ансамблем, строем, чысцінёй і ўстойлівасцю вакальнай інтанацыі. Злучэнне харэаграфічных рухаў са спевам. Выкананне твораў на сцэне.

**7. Канцэртная дзейнасць**

*У*дзел у канцэртах, фестывалях і конкурсах.

**Выніковы занятак**

Канцэрт з запрашэннем бацькоў.

## Прыкладны рэпертуар

1. Масленічныя песні:
– “А ў нас сёння масленка”,
– “А на гары сонца”,
– “Чаму ж табе , масленка”.
2. Вяснянкі:
– “Ой вясна, ой вясна”,
– “Вясна, вяс(ы)на на калочку”,
– “Вясна, хадзі ў двору”.
3. Вялікдзень:
– “Вялічка ідзець”,
– “Ды йшла туча”,
– “А ці дома, дома, пане гаспадару”.
4. Юр’я:
– “Юр’я на дварочку”,
– “Юр’ева матка”,
– “Зарадзі, божа, жыта”.
5. Тройца:
– “Ой, бяроза белая”,“Грушка”,
– “На граной нядзелі русалкі сядзелі”,
– “Я скакала, плясала”.
6. Купалле:
– “Купала, Купала”,
– “Ляцела дзераўцо”,
– “Цяцерка”.
7. Жніво
– “А на двары зміркаецца”,
– “Спор, жыта, спор”,
– “А йшоў Раю”,
– ”А ў нашага пана дажыначкі рана”.
8. Багач:
– “Авясец”,
– “А ў нашага гаспадара”,
– “Чачотка”.
9. Восень:

– “А у лесе грыбы зарадзілі”,
– “А ці выйшла асенняя тучка”,
– “А ў лесе грыбы зарадзілі”,
– “А ці выйшла асенняя тучка”,
– “Ой, бяроза белая”,
– “На граной нядзелі русалкі сядзелі”,
– “Грушка”.

10. Піліпаўка:
– “Каля майго церама”,
– “А ў новых сенях “.

11. Каляды:
– “Каму ехаць па калядыньку”,
– “Добры вечар, гаспадару”,
–“Ай калядачкі, бліны-ладачкі”,
– “Каму ехаць па калядыньку”,
– “Добры вечар, гаспадару”,
– “Ай калядачкі, бліны-ладачкі”,
– “Го-го-го, каза”.

## Чакаемыя вынікі

Па заканчэнні навучання навучэнцы павінны

**ведаць:**

– тэхніку выканання каляндарна-абрадавай музыкі беларусаў;
– народнае музычна-харэаграфічнае мастацтва Беларусі;
– значнасць традыцыйнай культуры свайго народа ў сістэме культуры чалавецтва;

**умець:**

– засвойваць рэгіянальныя этнафанічныя традыцыі (метадам уключанага назірання і апасродкавана – з дапамогай аўдыё і відэаапаратуры);
– працаваць над развіццём голасу на аснове аналізу мастацка-вобразнай сістэмы этнафанічнага рэпертуару;
– ажыццяўляць мастацкае рэканструяванне абрадавых і пазаабрадавых песень;
– выконваць творы з беларускага календара (восеньскія абрады: “Жніво”, “Багач”, “Піліпаўка”; зімовыя і веснавыя святы: “Каляды”, “Валачобніцтва”; летні цыкл песень: “Купалле”);

**валодаць:**

– аўтэнтычнай манерай спеваў абрадавай і пазаабрадавай паэзіі;
– функцыянальным зместам рознажанравых песенных твораў.

## Формы падвядзення вынікаў рэалізацыі праграмы

Форма выніковага кантролю ведаў навучэнцаў – канцэрт з запрашэннем бацькоў.

## Формы і метады рэалізацыі праграмы

Для дасягнення пастаўленай мэты і рэалізацыі праграмы выкарыстоўваюцца наступныя метады навучання:

– славесныя метады (тлумачэнне, апавяданне, дыялог, гутарка, абмеркаванне, вобразныя параўнанні, ацэнка, аналіз, пытанні, заахвочванні, ўказанні, удакладненні);

– метад практыка-арыентаванай дзейнасці (практыкаванні, рэпетыцыі);

– наглядны метад навучання (дэманстрацыйныя і наглядныя матэрыялы);

– рэпрадуктыўны (узнаўленне практыкаванняў па тэхніцы маўлення, рытмапластыцы);

– выкарыстання на занятках сродкаў мастацтва (літаратуры, музыкі, тэатра, выяўленчага мастацтва, кіно, радыё і тэлебачання).

Для рэалізацыі праграмы арганізацыі навучання прадстаўлена ў форме гуртавых занятак. Характэрна паасобнае, самастойнае выкананне дзецьмі вучэбных заданняў.

На занятках выкарыстоўваюцца здароўезберагальныя тэхналогіі (практыкаванні для вачэй, дыхальныя практыкаванні, фізкультхвілінкі, чаргаванне розных відаў дзейнасці і г.д.).

Пры рэалізацыі праграмы выкарыстоўваюцца наступныя сродкі навучання: слайды, схемы, малюнкі, прэзентацыі, творы мастацтва, кнігі, навучальныя дапаможнікі, часопісы, відэаматэрыялы, аўдыёматэрыялы і г.д.

Формы бягучага кантролю ведаў вучняў: назіранне, аналіз, гутарка, апытванне, тэсціраванне, канцэрт.

## Літаратура і інфармацыйныя рэсурсы

1. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі ад 13 студзеня 2011 г. (у рэд. Закона Рэспублікі Беларусь ад 14 студзеня 2022 г. № 154-З) [Электронны рэсурс] // Нацыянальны прававы інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12200154&p1=1&p5=0/.

2. Пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 07.08.2019 № 525 «Спецыфічныя санітарна-эпідэміялагічныя патрабаванні да зместу і эксплуатацыі ўстаноў адукацыі» (у рэд. Пастановы Савета Міністраў ад 17.01.2022 № 29, ад 31.08.2022 № 570).

3. Пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 06.09.2017 № 123 «Аб зацвярджэнні тыпавых праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі» [Электронны рэсурс]: // Нацыянальны прававы Інтэрнэт-партал Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=W21732482p&p1=1/

4. Палажэнне аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (зацверджана пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25 ліпеня 2011 г., N 149) [Электронны рэсурс] // Нацыянальны адукацыйны партал. – Рэжым доступу: www.adu.by/wp-content/uploads/2014/posle_urokov/...i...i

5. Волков, Г. Н. Этнопедагогика : Учеб. для студ. сред. и высш. пед. учеб. заведений / Г. Н. Волков – М. : Академия, 1999. – 168 с.

6. Вясна на Беларусі: Рэпертуарны зборнік. – Мінск: НЦТДіМ,1998.

7. Гульні, забавы, ігрышчы / Уклад. А. Лозка. – Мінск : Беларуская навука, 1996. – 534 с.

8. Дзіцячы фальклор / Уклад. Г. А. Барташэвіч, уклад. муз. часткі В. І. Ялатаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1972. – 736 с.

9. Кукушкин В. С., Столяренко Л. Д. Этнопедагогика и этнопсихология / В. С. Кукушкин, Л. Д. Столяренко. – Ростов-на-Дону : Феникс, 2000. – 448 с.

10. Курыловіч, Г.М. Этнаграфія дзяцінства // Этнаграфія Беларусі: Энцыклапедыя / Рэдкал. І.Шамякін (гал.рэд.) і інш. – Мінск : БелСЭ,1989. – С. 546.

11. Мядоцкі край і яго таленты : Даведнік фестывалю (30 мая – 1 чэрвеня 1997 г., в. Мётча) / Укл. М. Козенка. – Мінск : ВЛАДИ-АРТ, 1997. – 109 с.

12. Науменко, Г. М. Фольклорная азбука : Учебное пособие для начальной школы / Г. М. Науменко – М. : Издательский центр «Академия», 1996. – 136 с.

13. Ракава, Л. В. Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы / Л. В. Ракава – Мінск :Ураджай, 2000. – 111 с.

14. Фольклорный ансамбль / Музыка : Программы для внешкольных учреждений и общеобразовательных школ. – М : Просвещение, 1986. – С. 356-366.